6. О некоторых вопросах автомобильных перевозок пассажиров : постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 30 июня 2008 г., № 972 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. 2008. № 186. 5/28040.

7. О нормативных правовых актах Республики Беларусь : закон Респ. Беларусь, 10 янв. 2000 г. № 361-З : с изм. и доп. : текст по состоянию на 10 нояб. 2012 г. // КонсультантПлюс : Беларусь. Версия Проф. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2012.

8. О транспортной безопасности : федер. закон Рос. Федерации, 9 февр. 2007 г., № 16-ФЗ // КонсультантПлюс : Версия Проф. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр». М., 2012.

9. Об автомобильном транспорте и автомобильных перевозках : закон Респ. Беларусь, 21 июля 2001 г. № 278-З : в ред. закона Респ. Беларусь от 4 янв. 2010 г. // КонсультантПлюс : Беларусь. Версия Проф. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр». Минск, 2012.

10. Об автомобильных дорогах и дорожной деятельности : закон Респ. Беларусь, 2 дек. 1994 г., № 3434-XII : в ред. закона Респ. Беларусь от 14 июля 2011 г. // КонсультантПлюс : Беларусь. Версия Проф. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр». Минск, 2012.

11. Об основах транспортной деятельности : закон Респ. Беларусь, 5 мая 1998 г., № 140-З : в ред. закона Респ. Беларусь от 9 нояб. 2009 г. // Ведамасці Нац. сходу Рэсп. Беларусь. 1998. № 20. Ст. 221.

12. Об утверждении Авиационных правил выдачи свидетельств и классификации авиационного персонала гражданской авиации Республики Беларусь : постановление М-ва транспорта и коммуникаций Респ. Беларусь, 31 мая 2011 г., № 36 // Эталон – Беларусь [Электронный ресурс] / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2012.

13. Об утверждении Авиационных правил организации воздушного движения : постановление М-ва транспорта и коммуникаций Респ. Беларусь, 12 июня 2009 г., № 56 // Эталон – Беларусь [Электронный ресурс] / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2012.

14. Об утверждении Устава железнодорожного транспорта общего пользования : постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 2 авг. 1999 г., № 1196 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. 1999. № 67. 5/1506.

15. Правила дорожного движения : утв. указом Президента Респ. Беларусь, 28 нояб. 2005 г., № 551 // Эталон – Беларусь [Электронный ресурс] / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2012.

Дата поступления в редакцию: 28.11.12

***L.A. Polishchuk**, candidate of law, associate professor, associate professor of the chair of civil and labour law of the Academy of the Ministry of Internal Affairs of the Republic of Belarus*

LEGAL PROBLEMS OF TRANSPORTATION SAFETY REGULATION OF THE REPUBLIC OF BELARUS

Keywords: transport activity, regulation of transport, safety of transport, the legal relations in the field of transport safety.

*Article is devoted to a problem of legislative settlement of the relations in the field of safety of transport activity in Republic of Belarus. The author hays special attention to the absence of a single approach in law enforcement practice. He suggests measures to improve the legal regulation of the relations under consideration. The research carried out by the author may serve as a basis for developing more efficient methods of management.*

УДК 930

***А.М. Сувалаў**, кандыдат гістарычных навук, намеснік начальніка кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь*

## АСАБЛІВАСЦІ НАВУКОВАГА ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАГА ЭТНАСУ Ў КАНЦЫ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

Ключавые словы: беларусы, беларуская мова, гістарычныя погляды, гістарыяграфія, заходнерусізм, славяне, славянскае адзінства, праваслаўе, каталіцызм, руская мова, фалькларыстыка, этнас, этнагенез, этнаграфія.

*У артыкуле разглядаюцца асаблівасці вывучэння беларускага рэгіёна ў канцы XIX – пачатку XX ст., калі інтарэс да беларусаў і іх этнічнага паходжання набывае навуковы характар. Этнагенезам беларусаў у гэты час цікавяцца вучоныя з рознымі, часам супрацьлеглымі поглядамі на этнічную прыналежнасць і этнічную гісторыю Беларусі. Аналізуюцца пазіцыі расійскай афіцыйнай навукі, прыхільнікаў заходнерусізму і прадстаўнікоў беларускай плыні.*

У канцы XIX – пачатку XX ст. расійская афіцыйная навука ігнаравала наяўнасць украінцаў і беларусаў як самастойных народаў. Тым не менш у разглядаемы перыяд падлік і класіфікацыя насельніцтва Беларусі грунтаваліся на навуковых крытэрыях. На аснове навуковых падлікаў П.Н. Бацюшкоў налічваў сярод насельніцтва Заходняга края менш 9 % палякаў. Тым не менш і ў гэты час, як то было характэрна для ўсяго XIX ст., адным з галоўных аргументаў рускасці рэгіёна заставалася праваслаўнае веравызнанне насельніцтва [2, с. 17–18].

Традыцыйна расійская гістарыяграфія лічыла, што Люблінская унія 1569 г. прывяла да знішчэння самастойнасці ВКЛ і ўключэння гэтай дзяржавы ў склад Польшчы [2, с. 19]. Назва Рэчы Паспалітай абодвух народаў Кароны Польскай і Вялікага княства Літоўскага ў гістарыяграфіі таго часу падмянялася паняццем Польшча без тлумачэнняў і ўдакладненняў. Даследчыкі не звярталі ўвагі на розны статус усходнеславянскіх тэрыторый, напрыклад Украіны, якая пасля 1569 г. знаходзілася ў складзе Кароны Польскай, і Беларусі, якая працягвала заставацца ў межах ВКЛ. Не ўлічвалася тое, што згодна з заканадаўствам таго ж ВКЛ і пасля Люблінскай уніі іншаземцы, у тым ліку і палякі, не мелі права набываць нерухомую маёмасць (зямлю) і

пасады ў межах гэтай дзяржавы. Гэта абцяжарвала магчымасць польскай экспансіі ў Беларусь, чаго не было ва Украіне. Расійскія даследчыкі больш сур'ёзна вывучалі праблемы, звязаныя з Украінай, чым з Беларуссю. Сітуацыя ва Украіне аўтаматычна пераносілася і ў Беларусь. Лічылася, што вынікам шчыльнага збліжэння краін у межах Рэчы Паспалітай абодвух народаў сталі значны ўплыў польскай культуры на насельніцтва ВКЛ і змены ў этнічнай сітуацыі ў Беларусі на карысць польскага этнасу. Шырока выкарыстоўвалася і традыцыйная ідэя захопу літоўцамі і палякамі Беларусі ў час, калі Расія трапіла пад татара-мангольскае іга.

Гісторыя Беларусі і Літвы ў гістарыяграфіі канца XIX – пачатку XX ст. працягвала атаясамлівацца з гісторыяй Паўночна-заходняга края Расіі [2, с. 2]. Першы этап узаемаадносін славянскага насельніцтва ВКЛ з балтамі (літоўцамі ў тэрміналогіі таго часу) характарызаваўся расійскімі даследчыкамі як у асноўным мірнае ўзаемадзеянне, пры якім славяне дамінавалі. Літоўцы (балты), як менш развітыя ва ўсіх адносінах за славян, пераймалі ад іх мову, звычаі і веравызнанне. Апошняе на думку даследчыкаў адыгрывала выключную ролю ў паступовым працэсе русіфікацыі Літвы (тэрыторыі балтаў). Працэс уплыву славян на літоўскае насельніцтва прыводзіў да таго, што славяне і балты пачынаюць складаць «як бы адзін народ» [2, с. 2; 3, с. 65, 68–69, 83]. Указаны тэзіс з'яўляўся часткаю схемы этнічнага развіцця насельніцтва на тэрыторыі Беларусі. Схема выглядала наступным чынам. Славяне, як больш развітыя ў сацыяльна-эканамічным, культурным і палітычным плане за сваіх суседзяў, аказвалі на балтаў уплыў і паступова іх падпарадкоўвалі. Указаны ўплыў з цягам часу павінен быў прывесці да русіфікацыі балтаў (літоўцаў), якія апынуліся ў сферы ўздзеяння ўсходніх славян. Такі «станоўчы» працэс этнічнага развіцця быў перарваны спачатку палітычным падзелам усходнеславянскага свету ў выніку татара-мангольскага пагрому, які паклаў канец былому адзінству ўсходніх славян, а затым унійнымі адносінамі паміж ВКЛ і Каронаю Польскай. Пашырэнне ўплыву палякаў прывяло не толькі да спынення русіфікацыі літоўцаў (балтаў) у ВКЛ, але і да таго, што і самі ўсходнія славяне княства падпадалі пад культурнае ўздзеянне спачатку літоўцаў (балтаў), а затым і тых жа палякаў. Па ацэнках расійскіх даследчыкаў фактар веравызнання адыгрываў у працэсе этнічнага развіцця рэгіёна выключную ролю. Разам з прыняццем лацінства (маецца на ўвазе рымска-каталіцкае веравызнанне) распаўсюджваецца і польская народнасць (пальшчызна). Далейшае этнічнае развіццё беларускага рэгіёна, звязанае з «вяртаннем» у межы адзінакроўнай Расіі, аднаўляла перапыненую польскім лацінствам тэндэнцыю. Апалячаная і акаталічаная частка ўсходніх славян праз сістэму адміністрацыйных мерапрыемстваў, адукацыю і пашырэнне ўплыву праваслаўя ў рэгіёне павінна была «вярнуцца» да спрадвечнай рускасці Беларусі. Да канца разглядаемага перыяду вучоныя не змаглі прыйсці да разумення, што асобныя часткі ўсходніх славян у выніку працяглага ізаляванага адзін ад аднаго развіцця набываюць адрозненні не толькі ў выніку нейкага знешняга ўздзеяння рэлігійнага, культурнага, палітычнага і іншых фактараў, але і як вынік унутранага развіцця гэтых частак. Даследчыкі разглядаемага перыяду ў сваёй большасці не змаглі зразумець і паказаць, што не толькі беларусы за перыяд знаходжання ў складзе ВКЛ і Рэчы Паспалітай абодвух народаў набылі новыя рысы, але і самі вялікарусы за час татара-мангольскага іга і за перыяд самастойнага развіцця ў межах спачатку ВКЛ, а пазней царства і імперыі, выпрацавалі новыя этнічныя асаблівасці, якіх не было і проста не магло быць у перыяд Кіеўскай Русі.

Станоўчай асаблівасцю гістарычнай навукі канца XIX – пачатку XX ст. ад папярэдняга часу было тое, што, па-першае, вучоныя ўжо разумелі адсутнасць адназначнай тоеснасці паміж веравызнаннем і народнасцю [15, с. 48–49], а па-другое, насельніцтва Беларусі, якое атаясамлівала на той час сябе з палякамі праз прыналежнасць да каталіцтва, генетычна выводзілася ад усходнеславянскага насельніцтва [16, с. 6–7]. Аднак цалкам пазбавіцца ад гэтай старой традыцыі гістарычная навука да канца разглядаемага перыяду так і не змагла. Напрыклад, сувязь рэлігіі і народнасці можна пабачыць у А.І. Лявіцкага [7, с. 627] і І. Фудзеля [11, с. 2, 10]. Яшчэ больш яскрава гэта прасочваецца ў І.А. Чыстовіча [13, с. 9; 14, с. 25, 39, 52]. Распісваючы гісторыю манастыроў і цэркваў Заходняй Русі, І. Чыстовіч не ўказвае асаблівасцей розных яе тэрыторый у плане таго, якое насельніцтва ў этнічным плане там пражывала. Яго гэта не цікавіла па двух прычынах. Па-першае, ён як доктар багаслоўя займаўся менавіта рэлігійнай гісторыяй рэгіёна. Па-другое, І. Чыстовіч напачатку працы адразу акцэнтаваў увагу на сувязь рэлігіі і народнасці, і, такім чынам, праваслаўнае насельніцтва надалей называў выключна рускім без удакладненняў. Таму для яго было дастаткова высвятляць рэлігійную прыналежнасць тэрыторый і па ёй адназначна вызначыць нацыянальны склад насельніцтва.

Мяняецца сітуацыя і ў лакалізацыі тэрыторыі Беларусі. Так П.Н. Бацюшкоў да Беларусі адносіў не толькі дзве губерні: Магілёўскую і Віцебскую, за выключэннем паветаў апошняй Дзінабургскага, Люцынскага і Рэжыцкага, як гэта раней рабіў І. Турчыновіч [9, с. 7]. П.Н. Бацюшкоў сцвярджаў, што апрача ўказаных тэрыторый беларусы пражывалі ў губернях Мінскай і Гродзенскай, за выключэннем паўднёвых паветаў, у частцы Віленскай губерні за выключэннем паўночна-заходняга яе кута і ў губерні Смаленскай [2, с. 1]. І.В. Шэлепін, называючы Беларусь Паўночна-Заходнім краем, да беларускіх тэрыторый адносіў Магілёўскую, Мінскую і ўсходнія часткі Гродзенскай, Віленскай, Віцебскай губерній [15, с. 3].

У грамадскай і навуковай думцы працягвала развівацца і ідэалогія заходнерусізму. Пакідаючы па-за разглядам палітычны аспект указанай ідэалогіі, звязаны з адмоваю беларусам у іх праве на этнічную самастойнасць, звернем увагу на навуковае значэнне дзеячоў гэтага накірунку. Вывучэнне Беларусі нават з пэўнай зададзеннасцю і прадузятасцю тым не менш пашырала поле для навуковага аналізу. У навуковае абарачэнне ўводзілася значная колькасць крыніц, а абвастрэнне палемікі паміж рознымі групоўкамі ўзбуджала яшчэ большы інтарэс (у тым ліку і навуковы) да тэмы. Так, даследчык А.П. Сапуноў, які выступаў

паслядоўным прыхільнікам заходнерускай ідэалогіі, быў вядомы таксама як манархіст і прыхільнік ідэі спрадвечнай цягі Беларусі да Расіі. Адначасова ён з'яўляўся вучоным, які займаў адно з першых месцаў сярод тых, хто індывідуальна займаўся публікацыяй крыніц па гісторыі Беларусі [10, с. 230]. Па яго ўласных успамінах, за час свайго навучання ў Віцебскай губернскай гімназіі і Пецярбургскім універсітэце ён ні слова не чуў пра Беларусь [12, с. 120–121]. Жадаючы выправіць сітуацыю, вучоны сваю творчасць прысвяціў «адкрыццю» беларускай праблематыкі, няхай і ў духу заходнерусізма.

Гістарычная думка Расійскай імперыі канца XIX – пачатку XX ст. развівалася ў такіх навуковых цэнтрах таго часу, як Масква, Пецярбург, Кіеў, Дэрпт і Варшава. Спробы ініцыяваць аднаўленне ўніверсітэта ў Вільні не прынеслі жаданых вынікаў, таму даследаванні Беларусі ажыццяўляліся вучонымі або ў вышэйназваных навуковых цэнтрах, або намаганнямі асобных энтузіястаў.

Як і раней на погляды даследчыкаў працягвалі аказваць уплыў фактары ненавуковага характару: палітыка і ідэалогія. Напрыклад, нежаданне бачыць з'явы, якія ўжо рэльефна праявіліся і рэальна існавалі на той час (беларуская культура, літаратура, беларускі нацыянальны рух), можна патлумачыць толькі палітыка-ідэалагічнымі перакананнямі аўтараў.

Канец XIX ст. мяняе сітуацыю ў грамадскай думцы Беларусі. У Маскве ў 1891 г. групай студэнтаў-беларусаў, якія па палітычных матывах сядзелі ў Бутырскай турме, быў арганізаваны «Беларускі сацыялістычны гурток». У 1902 г. арганізаваўся «Круг беларускай народнай прасветы і культуры беларускай», мэтай якога былі распаўсюджанне друкаваўшыхся па-за межамі беларускіх выданняў і пошук сродкаў для выдання ў Расіі беларускай літаратуры. Дзякуючы яго намаганням, былі выдадзены «Вязынка» І. Неслухоўскага (для цэнзуры яна была прадстаўлена як напісаная па-балгарску) і на гектографе «Калядная пісанка» і «Вялікодная пісанка» (выдадзены ў 1903–1904 гг., прадстаўлялі сабою невялікія літаратурныя зборнікі навейшых твораў на беларускай мове). Ідэя, якая прапагандавалася падобнай літаратурай, звязвала эмансіпацыю беларуса як чалавека і грамадзяніна з эмансіпацыяй беларускай народнасці [8, с. 16].

Характэрнай рысай перыяда стала канчатковае ідэалагічнае і палітычнае афармленне беларускай плыні. Захоўваецца традыцыя ранейшага часу, калі айчынныя вучоныя адначасова з навуковымі заняткамі займалі актыўную жыццёвую пазіцыю і вялі палітычную барацьбу за свае перакананні. Адмоўны момант падобнай сітуацыі заключаўся ў тым, што, па-першае, любыя рэпрэсіі і праследванне з боку ўрада вучоных за іх палітычную дзейнасць змяншала і без таго невялікую армію айчынных даследчыкаў, а па-другое, уласныя палітычныя і ідэалагічныя перакананні навукоўцаў аказвалі ўплыў на іх даследаванні. У якасці прыкладу сумяшчэння палітычнай і навуковай дзейнасці можна ўзгадаць такіх дзеячоў, як М. Багдановіч [1], Я. Купала [6], М. Гарэцкі [4] і М.В. Доўнар-Запольскі [5].

Такім чынам, пры захаванні вялікадзяржаўных пазіцый у перыяд канца XIX – пачатку XX ст. адбываюцца надзвычай істотныя з'явы, якія ў далейшым сталі асновай для перагляду падыходаў да праблемы этнагенезу беларусаў. Маецца на ўвазе тое, што больш глыбокі аналіз працэсаў этнічнага і гістарычнага развіцця на землях Усходняй Еўропы паказваў хісткасць, схематызм і нявартасць вялікадзяржаўных канцэпцый этнагенезу беларусаў. Імкненне заставацца на пазіцыях непрызнання факта існавання асобных усходнеславянскіх народаў прыходзіла ў супярэчнасць з новымі даследаваннямі і распрацоўкамі. Трактоўкі этнічнага развіцця ў даследаваннях аўтараў гэтага часу набываюць значную варыятыўнасць. Іх аб'ядноўваюць толькі галоўныя або краевугольныя моманты, сярод якіх перакананне ў наяўнасці агульнай рускай еднасці на першым этапе развіцця усходніх славян; выдзяленне татара-мангольскага нашэсця ў якасці дамінуючай або адной з галоўных прычын парушэння еднасці ўсходнеславянскага свету; гіпербалізацыя ўплыву іншаэтнічнага фактара на з'яўленне, станаўленне і развіццё нацыянальных асаблівасцей беларускага этнасу; нежаданне прызнаваць існаванне беларускага народа як самастойнага этнічнага ўтварэння.

Разам з тым інтэнсіўнасць даследаванняў па розных накірунках (фалькларыстыка, этнаграфія, гісторыя, археаграфія, мовазнаўства і г. д.), павелічэнне якасці гэтых распрацовак прыводзілі да сітуацыі, калі патрабавалася толькі супаставіць іх вынікі і з выключна навуковых пазіцый даць ім ацэнку – прызнаць за беларусамі права лічыцца асобым усходнеславянскім народам.

1. Багдановіч, М.А. Беларускае адраджэнне / М.А. Багдановіч. Мінск : Універсітэцкае, 1994.

2. Батюшков, П.Н. Белоруссия и Литва: исторические судьбы Северо-Западного края / П.Н. Батюшков. СПб. : Тип. т-ва «Общественная польза», 1890.

3. Бессонов, П.А. Белорусские песни с подробными объяснениями их творчества и языка, с очерками народного обряда, обычая и всего быта / П.А. Бессонов. М. : Тип. Бахметева, 1871.

4. Гарэцкі, М. Развагі і думкі (фрагмент) / М. Гарэцкі // Беларуская думка XX стагоддзя: філасофія, рэлігія, культура : анталогія. Варшава : ІС ПАН, 1998.

5. Доўнар-Запольскі, М.В. Асновы дзяржаўнасці Беларусі / М.В. Доўнар-Запольскі. 2-е выд. Вільня : Прамень, 1919.

6. Купала, Я. Вера і націoнальнасьць / Я. Купала // Беларуская думка XX стагоддзя: філасофія, рэлігія, культура : анталогія. Варшава : ІС ПАН, 1998.

7. Левицкий, О.И. Основные черты внутреннего строя западно-русской церкви в XVI и XVII вв. / О.И. Левицкий // Киев. старина. 1884. № 8.

8. Турук, Ф.Ф. Белорусское движение: очерк истории национального и революционного движения белорусов / Ф.Ф. Турук. М. : Тип. Подотд. инвалидов, 1921.
9. Турчинович, О.В. Обозрение истории Белоруссии с древнейших времен / О.В. Турчинович. СПб. : Тип. Э. Праца, 1857.
10. Улащик, Н.Н. Очерки по археографии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода / Н.Н. Улащик. М. : Наука, 1973.
11. Фудель, И.И. Наше дело в Северо-Западном крае / И.И. Фудель. М. : Унив. тип., 1893.
12. Хмельницкая, Л.В. Эволюция взглядов А.П. Сапунова на проблему самоопределения белорусов / Л.В. Хмельницкая // Русь – Литва – Беларусь: проблемы национального самосознания в историографии и культуралогии. М. : Наследие, 1997.
13. Чистович, И.А. Диссидентский вопрос в Польше в первой половине XVIII столетия / И.А. Чистович. СПб. : Тип. Императ. Акад. наук, 1880.
14. Чистович, И. Очерк истории западно-русской церкви : в 2 т. / И. Чистович. СПб. : Тип. Департамента уделов, 1884. Т. 2.
15. Шелепин, И.В. Краткий очерк истории Западной России, Литвы и Польши / И.В. Шелепин. 2-е изд. Вильна : Тип. А.Г. Сыркина, 1901.
16. Эркерт, Р.Ф. Взгляд на историю и этнографию западных губерний России / Р.Ф. Эркерт. СПб. : Тип. Дома призрения малолетних бедных, 1864.

Дата поступления в редакцию: 21.02.13

***O.M. Suvalov***, *candidate of historical sciences, deputy head of the chair of the theory and the history of state and law of the Academy of the Ministry of Internal Affairs of the Republic of Belarus*

FEATURES OF THE SCIENTIFIC STUDY OF BELARUSIAN NATION IN THE LATE XIX – EARLY XX CENTURIES

Keywords: the Belarus, the Belarussian language, historical views, historiography, zapadnorusizm, the Slavs, slavic unity, Orthodoxy, Catholicism, the Russian language, the study of folklore, ethnos, ethnogeny, ethnography.

*The features of investigation of the Belarusian region at the end of XIX – early XX century are discussed in the article. At that time the interest towards ethnic Belarusians and their origin becomes scientific. At that time different scientists, with sometimes opposing views on the ethnicethnic identity and the history of Belarus, were intrested in the ethnogenesis of Belarusians. Positions of Russian official science, representatives of zapadnorusizm and Belarusian science are analysed in the article.*

УДК 347.77.043(476)

***Т.М. Халецкая***, *кандидат юридических наук, доцент, доцент кафедры гражданско-правовых дисциплин Белорусского государственного экономического университета*

## О МЕСТЕ ЛИЦЕНЗИОННОГО ДОГОВОРА В СИСТЕМЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВЕННОГО ПРАВА

Ключевые слова: исключительные права, лицензионный договор, результаты интеллектуальной деятельности, смешанные договоры.

*Лицензионный договор относится к малоизученным в отечественной цивилистике договорам, а немногочисленные публикации, затрагивающие те или иные его аспекты, свидетельствуют о недостаточном понимании правовой природы данного договора. Рассмотриваются проблемы определения места лицензионного договора в системе обязательственного права.*

В работах, посвященных исследованию договоров о передаче прав на использование объектов интеллектуальной собственности, лицензионный договор не обделен вниманием. В числе авторов, анализирующих в своих работах отдельные аспекты лицензионного договора, можно назвать В. Витко, С.С. Лосева, Р.А. Мерзликину, Ю.А. Федорову, С.А. Судярикова, Г. Штумпфа и др. Следует отметить, что в Российской Федерации за последние несколько лет было подготовлено несколько диссертаций на соискание ученой степени кандидата юридических наук, предметом изучения в которых являлся в том числе лицензионный договор. В частности, это диссертационные работы М.А. Астаховой, Е.П. Калиничевой, А.С. Касьянова, Л.Н. Хасимовой, В.А. Шуваева. В 2007 г. О.А. Рузаковой была защищена диссертация на соискание ученой степени доктора юридических наук на тему «Система договоров о создании результатов интеллектуальной деятельности и распоряжении исключительными правами».

Несмотря на такое количество работ, посвященных лицензионному договору, в науке нет единства позиций по таким важным вопросам, как понятие, правовая природа, классификация, содержание данного договора. Это, видимо, можно объяснить, с одной стороны, недостаточной разработанностью лицензионного договора в отечественном законодательстве, а с другой – исключительным многообразием «предметов и условий заключения лицензионных договоров» [14, с. 290].

Анализируя систему договоров в гражданском праве России, Ю.В. Романец относит договоры, направленные на использование исключительных прав, к договорам на оказание услуг [9, с. 4]. В цивилистической литературе подобный подход не нашел поддержки. Говоря о соотношении договоров, направленных